# Краязнаўчая газета

З 1838 года па 5 студзеня 1918 года ў Віцебску на рускай мове выдавалася газета "Витебские губернские ведомости" Віцебскім губернскім праўленнем. Мела афіцыйны і неафіцыйны (з 1845 года) аддзелы.

Неафіцыйны аддзел меў значэнне самастойнай газеты і ўзначальваў яго Аляксандр Максімавіч Семянтоўскі. З 1890-х гадоў у ёй шырока асвятлялася мясцовае жыццё, падзеі ў краіне і за мяжой, друкаваліся літаратурныя творы, даследаванні па гісторыі, этнаграфіі, фальклору.

Напрыклад, "Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні" А. М. Семянтоўскага (1872 г.), "Язычніцкія могілкі", "Пра вывучэнне дзіцячых беларускіх гульняў" (1890 г.) Е. Р. Раманава, "Нарысы простанароднага жыцця-быцця ў Віцебскай Беларусі і апісанне прадметаў ужытку" (1894 — 95 г.г.), "Простанародныя прадметы і павер'і, забабонныя абрады і звычаі, легендарныя паданні пра асобы і месцы" (1896 — 97 г.г.) М. Я. Нікіфароўскага, "Зямля і Араты" (1894 г.), "Лепельскі павет Віцебскай губерні" (1895 г.) "Старажытнасць беларускіх песень і іх напеваў" (1896 г.), І. Д. Гарбачэўскага, "Кароткая нататка пра беларускую гаворку" (1895 г.) У. К. Стукаліча, "Дзяды: Этнаграфічны нарыс жыцця Лепельскіх беларусаў" (1898 г.), "Новы год у вёсцы", "Зажынкі і абжынкі", "Талака" (усе 1903 г.), "Вясковыя святы" (1904 г.) А. Р. Пшчолкі. Шматлікія нататкі належалі пяру выдатнага краязнаўца Беларусі, у тым ліку Віцебшчыны, М. В. Доўнар-Запольскага, некаторыя іншыя.

Усе гэтыя творы тым ці іншым чынам пераклікаліся з гісторыяй цяперашняй тэрыторыі раёна, дзякуючы ўсё таму ж рускаму і беларускаму этнографу, археолагу і краязнаўцу А. М. Семянтоўскаму. Акрамя таго, мы абавязаны гэтаму чалавеку тым, што ён таксама доўгі час быў рэдактарам "Памятнай кніжкі Віцебскай губерні". Ён быў аўтарам прац па статыстыцы, археалогіі, побыту і культуры насельніцтва Віцебшчыны: "Статыстычнае апісанне Віцебскай губерні ў лясных адносінах" (1862 г.), "Сільнанабойная вытворчасць у Віцебску" (1864 г.), "Пра кірмашы Віцебскай губерні" (1867 г.), "Этнаграфічны агляд Віцебскай губерні (1872 г.), "Аб мерах і вазе, якія ўжываюцца ў Віцебскай губерні" (1874 г.), "Беглы статыстычны нарыс прыроды і насельніцтва Віцебскай губерні" (1880 г.), "Беларускія старажытнасці" (1890 г.). Усе гэтыя працы таксама датычаць гісторыі бешанковіцкага краю, з якім Аляксандр Максімавіч быў доўгі час цесна звязаны. Ён родам з Палтаўшчыны, дзе нарадзіўся ў 1812 годзе, а памёр у 1893 годзе. Сёлета б гэтаму выдатнаму краязнаўцу Віцебшчыны споўнілася 180 гадоў з дня нараджэння.

**А. НОВІК.**